View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

РАЗДЗЕЛ

I

# ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАЙ ПСТОРЫКА-ПРАВАВОЙ НАВУК1

## УКЛАД У БЕЛАРУСКУЮ Г1СТОРЫКА-ПРАВАВУЮ НАВУКУ ДОКТАРА ЮРЫДЫЧНЫХ НАВУК, ПРАФЕСАРА 1.А.ЮХО

**Т. І. Доунар**
*Беларуси дзяржауны утвератэт*

Доуп час гісторыя дзяржавы і права Беларусі не вывучалася. Некаторыя пытанні толькі закраналіся навукоуцамі дарэвалюцыйнага перыяду у кантэксце разгляду шшых праблем.

Пасля утварэння Беларускай ССР шэраг вучоных, у тым ліку першы рэктар БДУ У. І. Шчэта, пачалі актыуна даследаваць псторыю Беларусь Аднак у цэлым даследаванне прававой спадчыны беларускага народа, якое з'яуляецца важнейшай задачай псторыка-прававой навукі, у савецк перыяд стрымлівалася шматлікімі фактарамі.

У пасляваенны перыяд паступова пачынаюцца больш значныя зрухі у сферы распрацоук айчыннай гісторыі. З канца 50-х гг. XX ст. намаганнямі беларусшх вучоных-правазнауцау у рэспубліцы быу пакладзены пачатак новаму накірунку гісторыка-прававой навук - гісторыі дзяржавы і права Беларускай ССР. Значнай навуковай падзеяй стала выданне у 1958 г. у БДУ калектыунай працы «Очерки по истории государства и права БССР» (Б. Е. Бабщкь Ф. І. Гаузе, І. І. Гарэлш, Г. А. Павецьяу, Л. А. Рудзщкь І. С. Щшкевіч, Ю. П. Смірноу, В. Ф. Чыпр), у якой з пазщып тагачаснай

савецкай пстoрыка-прававой навук разглядаліся пытанні развщ-ця дзяржавы і права БССР з моманту яе узшкнення да 1934 г. Друкуюцца таксама кнМ С. П. Маргунскага (напрыклад, «Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства» (Мінск, 1966) і і ншых аутарау. У 1969 г. у выдавецтве БДУ калектывам аутарау таксама былі выдадзены (Б. Е. Бабщш, А. А. Галауко, Ф. І. Гаузе, І. І. Гарэлш, В. А. Дарогін і інш.) «Очерки по истории государства и права БССР» (выпуск друп), дзе разглядал^я пытанні развщця дзяржавы і права БССР з 1936 па 1968 г. Адказным рэдактарам і сааутарам гэтай кнМ быу І. А. Юхо. У гэтае выданне былі уключаны вышш кандыдацкай дысертацыі І. А. Юхо аб праблеме уз'яднання Заходняй Беларуи з БССР у 1939 г. (другая глава). Увогуле пытанням уз'яднання Заходняй Беларуи з Беларускай ССР быги прысвечаны шматлікія яго публшацып [1].

У 1970-1976 гг. бы^ надрукаваны два тамы акадэмічнага выдання «Истории государства и права Белорусской ССР», падрыхтаваныя калектывам акадэмічных і вузаускіх навукоуцау (С. П. Маргунсш, І. І. Пацяружа, В. Н. Арцёмава, Ю. П. Броука, М. В. Сторажау, У. І. Семянкоу, У. І. Шабайлау і інш.). Актыуны удзел у падрыхтоуцы гэтых выданняу прыняу І. А. Юхо.

Патрэбна падкрэслщь, што з 1963 г. І. А. Юхо пачау выкладаць у БДУ новую вучэбную дысцыплшу - пстoрыю дзяржавы і права Беларусі, вышкам чаго стала распрацоука вучэбнай праграмы па гэтым прадмеце [2], а таксама актытазацыя студэнцкіх і асшранцшх навуковых даследаванняу у сферы айчыннай прававой пстoрыь

У гэты перыяд І. А. Юхо прыкладвае намаганш да актуалізацыі пытанняу гісторыі дзяржавы і права Беларусі, спрабуе заявщь аб асаблівасцях беларускай гісторыі [3], а таксама выдае шматлікія навуковыя артыкулы па праблемных пытаннях айчыннай исторып [4], у якіх значную увагу звяртае на знакамітыя помшш права Беларусі феадальнага перыяду - Статуты 1529, 1566, 1588 гг., яшя называе зводамі законау Вялшага Княства ЛітоУскага [5].

У выдадзенай у 1978 г. на падставе доктарскай дысертацып манаграфіі «Прававое становшча насельніцтва Беларусі у XVI ст.», ён характарызуе структуру феадальнага грамадства на тэрыторып Беларусі, раскрывае прававы статус самага прывілеяванага саслоуя - шляхты, звяртае увагу на тое, што беларусшя сяляне мелі пэуныя правы, а не толькі значную колькасць абавязкау, гаворыць аб становшчы гарадскога насельніцтва, асабліва тых гарадоу, якія мелі магдэбургскае права, акцэнтуе увагу на тым, што з XIV ст.

беларусшя гарады пачалі атрымліваць права на самашраванне, на падставе чаго палггычна і эканамічна развіваліся не тольш гарады, але і сама дзяржаунасць.

Новыя прагрэсіуныя тэндэнцыі у развіцці дзяржаунасці Беларусі на пачатку 90-х гг. XX ст. мелі вышкам актытзацыю навуковых даследаванняу і арыентацыю даследчыкау на праУдзівы і плюралістычны падыход да асвятлення пстарычных працэсау. Галоунай падставай актыунай распрацоУкі айчыннай гісторыі стала заканадаучае замацаванне у дзеючай Канстытущп Рэспублікі Беларусь факта шматвяковага ^навання беларускага этнасу і беларускай дзяржаунасщ як суб'ектау сусветнай псторыь Беларусь стала на шлях пабудовы суверэннай прававой дзяржавы, і таму вельмі актуальным стау нацыянальна-дзяржауны падыход у вывучэнні гісторыі дзяржавы і права Беларусі, пры яшм распрацоука гісторыі уласнага народа з'яулялася прыярытэтным нашрункам навуковых даследаванняу. Усведамленне характару свайго уласнага пстарычнага шляху стала таксама ядром новай канцэпщп щэалоги беларускай дзяржаунасщ.

Беларусшя вучоныя пачалі пераасэнсоуваць уласную псторыю, паказваць уласнае разуменне пстарычных падзей і працэсау. Напрыклад, частку створаных у беларускай псторып міфау развянчау М. Ермаловіч. З'яуляецца шэраг прац псторыкау (А. Грыцкевіча, З. Капыскага і інш.), фшосафау (В. Конана, І. Падокшына і інш.) адносна праблемных пытанняу псторып Беларусі і запаунення існуючых « белых плямау », у яшх у кантэксце агульных пстарычных пытанняу закраналіся і гісторыка-прававыя праблемы. У навуковых публшацыях беларусшх гісторыкау-правазнаУцаУ (А. Вішнеускага, Т. Доунар, У. Сільчанкі, С. Сокала, В. Шалкапляс і інш.) даследавал^я шматлікія пытанні прававой гісторыі.

Важнай падставай навукова-даследчай акты^зацып у сферы псторыка-прававой навукі сталі шматлікія артыкулы і кнігі прафесара І. А. Юхо, у яшх характарызавалася пстарычнае развіццё беларускай дзяржаунасці і нацыянальнай прававой сістэмы, аналізаваліся праблемныя пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусь Так, І. А. Юхо не аднойчы звяртау увагу на пытанне аб паходжанні беларускай дзяржаунасщ, якое дагэтуль застаецца канчаткова нявырашаным. Гэта абумоулена шэрагам прычын, а асабліва недастатковасцю дайшоушых да нашага часу шсьмовых крыніц, аналіз яшх дазволіу бы устанавіць сапраудныя час і прычыны, што прывялі да пераходу ад дадзяржауных формау грамад-

скага ^навання да палггыка-тэрытарыяльнай арганізацыі шравання грамадствам. Вынікам гэтага стала шматлшасць тэорый і прычын паходжання дзяржаунасщ ва Усходняй Еуропе і часам вельмі суб'ектыуных меркаванняу адносна гістарычнага перыяду Узнікнення дзяржаунасці. І. А. Юхо прааналізавау творы навукоуцау дарэвалюцыйнага і савецкага перыядау (У. Тацішчава, І. Забеліна, М. Дзьяканава, В. Сергеевіча, С. У. Юшкова, Б. Д. Грэкава, Б. А. Рыбакова і шш.), абагуліушы дакументальныя і леташсныя крыніцы, зрабіу вывад, што дзяржаунасць у народау Усходняй Еуропы паустала задоуга да новай эры. Ён падмацоувау гэты вывад спасылкамі на Герадота, які засведчыу ^наванне нашых продкау - будзінау і неурау, што жылі на тэрыторып сучаснай Беларусі у VI-V стст. да н. э., а таксама на меркаванш некаторых навукоуцау.

І. А. Юхо унёс вял^ уклад у развщцё беларускай псторыкаправавой навукь Яго навуковыя працы былі прысвечаны самым розным і вельмі актуальным праблемам псторып дзяржавы і права Беларусь паходжанню назвы «Беларусь», помншам айчыннага права, прававому становішчу насельнщтва, уніям ВКЛ з Польшчай, уплыву Польшчы і Расіі на псторыю беларускага народа, гісторыі заканадауства, прававым поглядам беларускіх мысліцеляу, значэнню псторыка-прававой навукі і інш. Так, ім упершыню была выказана думка аб непасрэдным удзеле вялікага беларускага гумашста і мысліцеля Ф. Скарыны у падрыхтоуцы знакамітага звода законау - Статута Вялікага Княства Лггоускага 1529 г. Вучоны выказау уласныя пазіцыі па праблеме фарміравання тэрыторыі Беларусі, абгрунтавау тэзіс аб значна больш старажытным паходжанні беларускай дзяржаунасщ, чым вызначанае у савецкай пстарычнай навуцы, аб пераважна беларусшм этнічным характары Вялікага Княства Л^оускага, падкрэслівау мінулыя айчынныя прававыя набытш, значнасць і прагрэсіунасць поглядау шматл^х беларускіх мысліцеляу, дзяржауных дзеячау мшулага перыяду і г.д. Напрыклад, некальш навуковых прац ён прысвяціу выдатнаму дзеячу нацыянальна-вызваленчага руху XVIII ст. Тадэвушу Касцюшку, яш пакшуу значны след у палітычным жыццi не толькі шэрагу еУрапейскіх дзяржау, але і у Злучаных штатах Амерыкь дзе змагауся за яе незалежнасць [6].

Кніга «Крыніцы беларуска-літоУскага права» (Мшск, 1991 г.) была прысвечана характарыстыцы важнейшых нарматыуных актау, яшя дзейнічалі на працягу стагоддзяу у Беларусь агульна-

земсшх, абласных, валасных, гарадскіх грамат, Судзебшка 1468 г., Статутау 1529, 1566, 1588 гг. і інш. На падставе сістэмнага аналізу помнікаУ права ён зрабіу вывад аб нацыянальнай адметнасці беларускага права і параунальна высокай тагачаснай прававой культуры беларускага народа, аб чым сведчыць заканадауства XV-XVI стст. і асабліва Статут 1588 г.

Важнай навуковай падзеяй стала выданне манаграфи І. А. Юхо «Гістарыяграфія псторып дзяржавы і права феадальнай Беларусь» (Мшск, 1999), дзе быу дадзены кароткі агляд навуковых публікацый, у яшх разглядал^я або закраналіся пытанш гісторыі дзяржавы і права Беларусь а таксама рабшася іх крытычная ацэнка. Асабліва ён падвергнуу крытыцы погляды польскіх навукоуцау адносна несамастойнасщ Беларусі і значнага уплыву польскага права. Навуковец звяртау увагу на прычыны тэндэнцыйных адносін шматл^х замежных навукоуцау да беларускай псторыЬ у сувязі з чым і узнікала замоучванне шматлікіх праблемных пытанняу, стварэнне «белых плям» і нават фальифшацыя айчыннай псторыка-прававой навукЬ

Шэраг артыкулау І. А. Юхо прысвящу развіццю юрыдычнай навукі у Беларусшм дзяржауным універсітэце, гісторыі грамадзянска-працэсуальнага права і інш. [7]. Акрамя таго, ён прыняу удзел у выданш на англійскай мове кшг аб гістарычным шляху беларускай нацып і дзяржавы [8].

І. А. Юхо прыняу удзел у падрыхтоуцы шэрагу энцыклапедычных выданняу, у тым ліку быу адным з ініцыятарау і аутарау першага на беларускай мове выдання «Юрыдычнага энцыклапедычнага слоушка» (Мінск, 1989), сааутарам і перакладчыкам энцыклапедычнага выдання «Статут Вялікага княства Лггоускага 1588»: Тэксты. Даведнік. Каментарый (Мінск, 1989). Напісау шмат артыкулау у ташя выданні, як «Мысліцелі і асветнікі Беларусі»: энцыклапедычны даведшк (Мінск, 1995), «Асветнікі зямлі беларускай» (Мшск, 2003), «Энцыклапедыя псторып Беларусі» : у 6 т. (1993-2004 гг.), «Вялшае княства Лггоускае»: энцыклапедыя : у 2 т. (2005-2006 гг.).

Важным нашрункам яго навуковай дзейнасщ было перавыданне гістарычных крынщ айчыннага права. Менавіта па шщыятыве І. А. Юхо быу перавыдадзены шэраг помнікаУ права Беларусі, у тым лшу Статут 1588 г. (1989) і Статут 1566 г. (2003), дзякуючы чаму актывізаваліся навуковыя даследаванні у сферы гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

Шэраг кшг Я. А. Юхо («Каротш нарыс псторып дзяржавы і права Беларусь» (Мшск, 1992), «Псторыя дзяржавы і права Беларусі» (Мшск, 2000) і інш.), у яшх разглядаецца у агульных рысах паэтапная гісторыя развіцця дзяржаунасці Беларум і выказваюцца уласныя погляды на айчынную прававую гісторыю, былі непасрэдна прызначаны студэнтам юрыдычных вышэйшых навучальных устаноу Беларусі. Гэтыя к н т з'яуляюцца і зараз важнейшымі вучэбнымі дапаможнікамі для студэнтау-правазнауцау ВНУ Рэспубл^ Беларусь.

Асаблівая заслуга прафесара І. А. Юхо у заснаванні навуковай псторыка-прававой школы Беларусі. Пад яго шраунщтвам было абаронена шэраг кандыдацшх і доктарскіх дысертацый. На падставе навуковых напрацовак І. А. Юхо, часта па яго ж шщыятыве, беларусшя псторыш права распрацоУвалі разнастайныя пытанні айчыннай гісторыі, публікавалі манаграфіі, вучэбныя дапаможнЬкі па псторып дзяржавы і права Беларум і г. д. Такім чынам, навуковая спадчына доктара юрыдычных навук, прафесара І. А. Юхо спрыяла развщцю беларускай гісторыка-прававой навуш і юрыдычнай адукацыі.

## Л1таратура

1. *Юхо, Я. А.* Уз'яднанне беларускага народа у адзінай Савецкай дзяржаве - завяршаючы этап тэрытарыяльнай кансалідацыі беларускай сацыялістычнай нацып / Я. А. Юхо // Фар]траванне і развіццё беларускай сацыял^тычнай нацыі / З. У. Доктарау [і інш.] ; рэдкал.: П. Ф. Глебка [і інш.] / Акад. навук БССР, !н-т фшасофп. - Мінск, 1958. - С. 129-143; *Юхо, Я.* Беларусь у новай польскай энцыклапедып / Я. Юхо // Полымя. - 1968. - № 4. - С. 177-180; *Юхо, И. А.* Установление советской власти в западных областях Белоруссии и воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве / И. А. Юхо // Очерки истории государства и права БССР; редкол.: И. А. Юхо (отв. ред.) [и др.]. - Минск, 1969. - Вып. 2. - С. 71-97.

2. *Юхо, И. А.* Программа по истории государства и права БССР / И. А. Юхо, Б. Е. Бабицкий. - Минск, 1964. - 17 с.

3. *Юхо, И.* А. Общественно-политический строй и право Литовского государства (XIII-XVI вв.) / И. А. Юхо // История государства и права СССР: учебник для студентов юрид. вузов и фак.: в 2 ч. / Моск. гос. ун-т им. М. В. Ломоносова; К. А. Сафроненко (отв. ред.) [и др.]. - М., 1967. - Ч. 1. - С. 238-265 і шш.

4. *Юхо, І.* З псторып права / І. Юхо // Беларусь. - 1966. - № 5. - С. 28; *Юхо, І.* Грамадсмя і прававыя погляды Скарыны / І. Юхо // Полымя. - 1967. - № 6. - С. 175-180; *Юхо, І.* А. Уладзімір Шчэта [Старонк беларус. энцыкл.] / І. А. Юхо // Полымя. - 1967. - № 5. - С. 251-252; *Юхо, Я.* Беларусь у новай польскай энцыклапедып / Я. Юхо // Полымя. - 1968. - № 4. - С. 177-180; *Юхо, Я.* Пра назву «Беларусь» / Я. Юхо // Полымя. - 1968. - № 1. - С. 175-182 і шш.

5. *Юхо, І.* ХТО складау Лггоусы Статут / І. Юхо // Беларусь. - 1958. - № 3. - С. 31; *Юхо, Я. А.* Статуты Вялшага княства Лггоускага / Я. А. Юхо // Полымя. - 1966. - № 11. - С. 125-137 і шш.

6. *Юхо, Я. А.* За вольнасць нашу і вашу: Тадэвуш Касцюшка / Я. А. Юхо. - Мшск, 1990. - 52 с.; *Юхо, Я. А.* Крынщы беларуска-лггоускага права / Я. А. Юхо; пад рэд. Т. Ф. Есшенкь - Мшск, 1991. - 238 с.; *Юхо, Я.* За вольнасць нашу і вашу [Тадэвуш Касцюшка] : урывак з нарыса / Я. Юхо // Бацькаушчына : зб. пст. лгг.: для сярэд. і ст. шк. узросту / уклад., прадмова С. С. Патзнша. - Мшск, 1994. - С. 96-98; *Юхо, Я. А.* «Нарадз^ся я лщьвшам...»: Тадэвуш Касцюшка / Я. А. Юхо, У. Емяльянчык. - Мшск, 1994. - 68 с.; *Юхо, Я.* Наш нацыянальны герой [Т. Касцюшка, 1745-1817] / Я. Юхо // Сыны і пасынк Беларус / С. В. Барыс, С. В. Тарасау, Г. А. Ланеуск [і шш.]; уклад. С. В. Барыс. - Мшск, 1996. - С. 95-134.

7. *Юхо, Я. А.* Развщцё юрыдычнай навук у Беларусмм дзяржауным утверсггэце [1926-1995 гг.] / Я. А Юхо // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. Права. - 1969. - № 1. - С. 3-6; *Юхо, И. А.* Юридическая наука БССР за 60 лет / І. А. Юхо // Правоведение. - 1979. - № 1. - С. 3-10; *Юхо, И. А.* Основы гражданского судопроизводства Союза ССР и ГПК союзных республик / И.А. Юхо // Соц. законность. - 1962. - № 7. - С. 38-43; *Юхо, И. А.* Гражданский процессуальный кодекс Польской Народной Республики / І. А Юхо // Советская юстиция. - 1967. - № 1. - С. 27-28.

8. Истарычны шлях беларускай нацып і дзяржавы = The history of the belarusan Nation and State / М. Біч, Р. Гарэцы, У. Конан [і шш.] ; рэдкал.: У. Арлоу [і шш.] ; перакл. на англ. А. Бурсау. - Мшск, 2005. - 440 с.; Истарычны шлях беларускай нацып і дзяржавы = The history of the belarusan Nation and State / М. Біч, Р. Гарэцы, У. Конан [і шш.]; рэдкал.: У. Арлоу [і шш.]; перакл. на англ. А. Бурсау. - Мшск, 2006. - 440 с.